(1971). Падзяляецца на 13 раёнаў; 4 гарады, 13 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Кустанай.

На Пн вобласці ч. Заходне-Сібірскай раўніны, якая на Пд пераходзіць у Тургайскае плато выш. да 414 *м*. З Пд на Пн цягнецца Тургайская лагчына. Карысныя выкапні: жал. руда (запасы больш за 22 млрд. *т*), баксіты, тытан, свінец, буры вугаль, азбест, вапняк, буд. матэрыялы. Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. на Пн −18, на Пд −17, ліп. адпаведна 19 і 22 °С. Ападкаў на Пн 300—350 *мм*, на Пд 200—250 *мм* за год. Найб. рака Тобал з прытокам Убаган. Многа салёных і прэсных азёраў, багатых на рыбу; найб. Кушмурун і Тэніз. Каратамарскае і Верхнетабольскае (будуецца, 1972) вадасховішчы. Глебы ў паўн. частцы чарназёмныя, у цэнтры і на Пд цёмна-каштанавыя. Расліннасць пераважна стэпавая, на Пд бярозавыя і бярозава-асінавыя гаі (калкі). Асн. насельніцтва казахі і рускія, ёсць украінцы, беларусы, татары і інш. Сярэдняя шчыльн. 7,9 чал. на 1 *км²*. Гарадскога нас. 42%. Гарады: Кустанай, Рудны, Джэтыгара, Лісакоўск.

Прамысловасць горназдабыўная, металаапрацоўчая, лёгкая, харч., эл.-энергетычная і буд. індустрыя. Найб. прадпрыемствы — Сакалоўска-Сарбайскі (Рудны) і Лісакоўскі горнаабагачальныя камбінаты па здабычы і абагачэнні жал. руды, азбеставы камбінат у Джэтыгары. У Кустанаі, Рудным, Затабольску, Камсамольцы з-ды і майстэрні па рамонце горнага абсталявання, будаўнічай, аўтамаб. і с.-г. тэхнікі. Дрэваапр. камбінаты ў Рудным і Азёрным, мэблевая ф-ка, з-д сілікатнай цэглы і шынарамонтны ў Кустанаі. Камвольна-суконны камбінат, з-ды штучнага валакна, абутковая і валюшна-лямцавая ф-кі ў Кустанаі. Прадпрыемствы рыбнай (Рудны), мясной (Кустанай, Джэтыгара), масласыраробна-малочнай (у гарадах, раённых цэнтрах і найб. сёлах), мукамольнай (Кустанай, Рудны, Джэтыгара, Віктараўка), кандытарскай, піваварнай (Кустанай) прамысловасці. Энерг. база — Кустанайская і Рудненская ЦЭЦ на карагандзінскім і экібастузскім вугалі. С. гасп. спецыялізуецца на вырошчванні збожжа, на мяса-малочнай і мяса-шэрснай жывёлагадоўлі. На пач. 1972 у вобл. 8 калгасаў і 178 саўгасаў. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1971) 5171,1, у т. л. пад збожжавымі 3926,0, тэхн. 64,1, агародніна-бахчавымі і бульбай 29,0, кармавымі культурамі 1157,7. Асн. збожжавая культура (тыс. *га*) яравая пшаніца 3348,6, з тэхн.— лён-кудравец 28,9. Сеюць ячмень, авёс, проса, грэчку. На пач. 1972 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 975,1 (у т. л. кароў 314,7), авечак і коз 673,6, свіней 332,7, коней 47,4. Даўж. чыгунак 835 *км* (1971). Чыгункі Цалінаград — Карталы, Троіцк — Кустанай — Какчэтаў, Кустанай — Джэтыгара. Шашэйных дарог 8,0 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 2,6 тыс. *км*. Пед ін-т, філіялы Цалінаградскага с.-г. і Казахскага політэхн. ін-таў; 14 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Драм. тэатр, філармонія. Краязнаўчы і геал. музеі. Абл. газ. «Коммунизм жолы» («Шлях да камунізма») і «Ленинский путь».

*Літ.*: Казахстан, М., 1970 (Советский Союз).
*С. А. Абдрахманаў*. Алма-Ата.

**КУСТАРЭЗ**, машына для расчысткі тэрыторыі ад хмызняку і драбналесся. Выкарыстоўваецца пры асваенні новых зямель, буд-ве дарог, пракладванні газаправодаў і г. д. К. падзяляюцца на адвальна-нажавыя, вальцавана-жавыя і нажавыя. Найб. пашыраныя адвальна-нажавыя К. складаюцца з штурхальнай рамы, клінападобнага адвала з гарызантальнымі нажамі, канатна-блочнай ці гідраўлічнай сістэмы кіравання.

Кустарэз Д-514А.



Выкарыстоўваюцца К.: Д-514А, Д-306А, Д-215А, К-32А, КБ-28, Д-174Г. К. тыпаў Д-514А, Д-174Г змантціраваны на трактары Т-100; маюць шырыню захопу 3,6 *м* і прадукцыйнасць 0,6—1 *га/гадз*. Кустарэз КБ-4,0 прыстасаваны для работы на забалочаных участках.

*Літ.*: Леонович И. И. Строительство лесных дорог, Мн., 1970; Епифанов Б. Е. и Ионов Б. Д. Дорожно-строительные машины в лесной промышленности и основы дорожного дела, М.— Л., 1961. *І. І. Леановіч*. Мінск.

**КУСТОДЗІЕЎ** Барыс Міхайлавіч [23.2 (7.3). 1878, Астрахань — 26.5.1927], рускі савецкі жывапісец, графік і тэатральны мастак. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1896—1903, акад. з 1909), у І. Я. Рэпіна. Чл. аб'яднання «Свет мастацтва» з 1911. Пісаў жанравыя палотны з побыту рус. правінцыі («Кірмаш», 1906; «Купчыха», 1915; «Чаяванне», 1913; «Маскоўская карчма», 1916; «Масленіца», 1916), стварыў партрэты І. Я. Білібіна (1901), Міці Шастаковіча (1919), Ф. І. Шаляпіна (1922), ілюстраваў творы М. Гогаля, М. Ляскова, М. Някрасава і інш. Пасля Кастр. рэв. звярнуўся да савецкай тэматыкі («Бальшавік», 1920; «Свята на плошчы Урыцкага ў дзень адкрыцця II кангрэсу Камінтэрна», 1921). Шэраг твораў прысвяціў У. І. Леніну. У Дзярж. маст. музеі БССР 11 жывапісных і 16 графічных твораў мастака, у т. л. «Купчыха з пакупкамі» (1920).

Б. М. Кустодзіеў. Купчыха з пакупкамі. 1920. Дзярж. маст. музей БССР.

